# білета



прадпрыемствах канструктарскую, тэхналагічную, пераддыпломную практыкі. Сувязь ВНУ з вытворчасцю вельмі моцная. Як вынік, вядучыя магілёўскія прадпрыемствы «Магілёўхімвалакно», «Магілёўліфтмаш» і іншыя ўзначальваюць менавіта нашы выпускнікі.

У БРУ ёсць цікавая традыцыя. Першага абітурыента, які паступае ў асноўны набор, тут віншуе сам рэктар. «Першы чалавек звычайна мэтанакіраваны, мае набор неабходных балаў, ведае, кім жадае стаць — абраў прафесію, спецыяльнасць», — усміхаецца Міхаіл Лусцянкоў.

Пакуль паступаючыя арыентуюцца на прахадныя балы мінулага года. Да 20 ліпеня будуць гатовыя спісы тых, хто залічаны ў ВНУ. Да 25-га яшчэ ёсць магчымасць для тых, каму не пашчасціла, падаць дакументы на расійскі бюджэт. Дарэчы, летась самая папулярная спецыяльнасць у БРУ была «Электронны маркетынг». Мяркуецца, што сёлета ў трэндзе будуць спецыяльнасці па IT-кірунках, будаўніцтве і тэхналогіі машынабудавання. Яны цяпер асабліва запатрабаваныя на рынку працы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

***P.S.*** *На 15 ліпеня ўсяго на расійскі і беларускі бюджэты ВНУ было пададзена больш чым 500 заяў. Лідзіруюць «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў», «Узвядзенне будынкаў і збудаванняў», «Сістэма кіравання інфармацыяй» і «Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцяў».*

# У МАЗЫР

Гомельскай вобласці наш універсітэт адзіны, дзе рыхтуюць спецыялістаў гэтага кірунку, — дадаў Барыс Крук.

Мазырская ўстанова вышэйшай адукацыі вылучаецца і тым, што адзіная на тэрыторыі Гомельшчыны навучае студэнтаў па спецыяльнасці «Інжынерна-педагагічная дзейнасць».

— Забяспечваем інжынернымі кадрамі ў сферы будаўніцтва, машынабудавання, а таксама агульнай установы адукацыі. Нашы выпускнікі, якія сёння працуюць ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, рэкамендуюць сваім навучэнцам наш універсітэт, рыхтуюць юнакоў і дзяўчат да паступлення менавіта да нас, — звярнула ўвагу **дэкан фізіка-інжынернага факультэта Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна Інеса КАВАЛЬЧУК.** — Важна, што спецыяльнасці, па якіх вядзецца навучанне ва ўніверсітэце, востра запатрабаваны на рынку працы. На кожнага выпускніка па педагагічных спецыяльнасцях звыш пяці заявак ад наймальнікаў, — дадала Інеса Мікалаеўна.

На першым этапе ўступнай кампаніі, да асноўнага дня прыёму дакументаў у Мазырскім дзяржуніверсітэце залічылі 19 пераможцаў універсітэцкай алімпіяды і 65 абітурыентаў, якія будуць атрымліваць вышэйшую адукацыю па дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста.

— Вельмі рады бачыць матываваных абітурыентаў, — ад сябе і ўсёй каманды дэканаў факультэтаў і выкладчыкаў зазначыла **першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна Ірына КАВАЛЕВІЧ.** — Штогод павялічваем колькасць бюджэтных месцаў. За апошнія два гады мы павялічылі іх на 15 %. У гэтым годзе ў цэлым набіраем 705 абітурыентаў, з іх 93 % (655 чалавек) змогуць атрымаць вышэйшую адукацыю за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Планамерна павялічваем і лічбы мэтавага прыёму. За апошнія два гады гэтыя паказчык павялічыўся ўдвая. У цэлым набіраем абітурыентаў па 18 спецыяльнасцях, пераважна педагагічнай накіраванасці. Другі год вядзём набор на новыя спецыяльнасці: «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя» і «Мастацкая адукацыя». У наступным годзе плануем першы набор па спецыяльнасці «Музычная адукацыя». Так зможам поўнасцю забяспечыць усю лінейку педагагічных спецыяльнасцяў, — рэзюмавала Ірына Кавалевіч.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# НАСТРОЙ НА ПЕРАМОГУ

## Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў вітае абітурыентаў

**Учарашнія школьнікі, іх родныя, блізкія і сябры запоўнілі сцены вышэйшых навучальных устаноў. Абітурыенты вельмі хвалююцца. Яшчэ больш перажываюць іх бацькі. Яно і зразумела — для ахвотных паступіць у ВНУ настаў час прыняць лёсавызначальнае рашэнне. Пра тое, што адбываецца цяпер у вядучым творчым інстытуце краіны, карэспандэнтам «Звязды» расказала рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля КАРЧЭЎСКАЯ.**

### НАПЕРАДЗЕ — «ТВОРЧАСЦЬ»

«Усяго за пару гадзін работы ў першы дзень мы назіралі велізарную колькасць абітурыентаў нашага ўніверсітэта, гэта сапраўды масавы ажыятаж, што не можа не радаваць, — падзялілася рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская. — Варта адзначыць, што гэта працяг уступнай кампаніі. Да нас ужо залічаны абітурыенты, якія паступалі па мэтавых дагаворах. Цяпер праводзіцца прыём дакументаў на агульных падставах, і, вядома, вельмі прыемна, што колькасць ахвотных вучыцца ў нас значна вырасла. Яшчэ за паўгадзіны да пачатку прыёму дакументаў каля дзвярэй універсітэта выстраілася цэлая чарга! Традыцыйна першым дзесяці абітурыентам падарылі сувеніры. Наперадзе ж яшчэ некалькі прадуктыўных дзён, таму спадзяёмся, што ўсё будзе добра».

Дарэчы, падаваць дакументы можна было і ў выхадныя дні. У тэрміны з 12 да 17 ліпеня, з 9.00 да 18.00 працуе прыёмная камісія. Ёсць людзі, якія прыязджаюць з іншых гарадоў. Шмат каму зручней было прыехаць сюды менавіта ў суботу або нядзелю.

Жадаючым паступіць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў акрамя ЦТ і ЦЭ здаюць і ўнутраны ўступны экзамен. «На кожны кірунак спецыяльнасці прадугледжаны экзамен «Творчасць». Зразумела, што калі абітурыент паступае на спецыяльнасць «Дэкарацыя дэкаратыўна-прыкладных вырабаў», то будуць іншыя экзамены, чым на «Харэаграфічным мастацтве». Папярэдне на працягу 2023/2024 навучальнага года ў нас актыўна ішла прафарыентацыйная кампанія. За гэты час было праведзена больш чым 20 Дзён адкрытых дзвярэй, а выязныя прафарыентацыйныя мерапрыемствы вылічваюцца дзясяткамі і сотнямі. Да будучых абітурыентаў мы паспяхова даводзілі асаблівасці нашай прыёмнай кампаніі», — адзначыла Наталля Карчэўская.

На спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» творчы экзамен складаецца з трох этапаў: абітурыенту неабходна выканаць, паказаць свае веды па класічным танцы, па сцэнічным конкурсным танцы і па кампазіцыі пастаноўкі танца. «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» — гэта малюнак, жывапіс і кампазіцыя. У рэжысёраў тэатралізаваных паказаў альбо рэжысуры тэатра часцей за ўсё першы экзамен — майстэрства акцёра, а другі — сама рэжысура.

Такім чынам, на кожную спецыяльнасць распрацоўваецца свая індывідуальная праграма. «І нашы абітурыенты добра ведаюць яе. На працягу года ахвотныя маглі атрымаць індывідуальныя кансультацыі. Многія моманты агучваліся на Днях адкрытых дзвярэй. Акрамя гэтага, на базе нашай установы арганізоўваюцца падрыхтоўчыя курсы. Дарэчы, самая актыўная частка работы падрыхтоўчага аддзялення праводзіцца цяпер, на працягу двух тыдняў перад уступнымі экзаменамі. Часта на падрыхтоўчыя курсы прыходзяць не толькі абітурыенты, якія будуць паступаць сёлета, але і тыя, каму яшчэ год трэба будзе вучыцца ў школе. Акрамя таго, у канікулярны перыяд мы даём інтэрнат на час падрыхтоўкі. На нашы курсы, як правіла, прыходзяць добра матываваныя абітурыенты, якія загадзя плануюць сваё будучае паступленне», — расказала рэктар.

Поўнае інтэрв'ю з рэктарам БДУКМ размешчана на сайце zviazda.by.

### І ВЕРА Ў СЯБЕ

Пасля размовы з рэктарам мы спусціліся на першы паверх. Там сапраўды аншлаг! Хтосьці перажывае, хтосьці досыць упэўнены ў сабе. Даведаліся, з якім настроем абітурыенты БДУКМ прыйшлі падаваць дакументы.

«Усё сваё жыццё я звязвала з творчасцю, — адзначыла **абітурыент БДУКМ Лізавета МАНЬКО.** — У пэўны момант зразумела, што хачу стаць сапраўднай актрысай. Аднак крыху пазней я трансфармавалася: вырашыла, што рэжысура тэатра — вось гэта дакладна маё! Таму і хачу паступіць на адпаведную спецыяльнасць».

Лізавета скончыла дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гімназія № 2 г. Бабруйска» і займалася ў тэатральным калектыве. «Я ўдзельнічала ў такіх пастаноўках, як «Паўлінка», — была ў галоўнай ролі, «Пэпі Доўгаяпанчоха», «Чароўная лямпа Аладзіна» і многіх іншых. Напэўна, хвалявання пры падачы дакументаў ужо няма, але думаю, на ўступных экзаменах яно яшчэ будзе. Але я веру ў сябе, таму з усім спраўлюся. Я здала ЦТ па гісторыі Беларусі на 95 балаў, па рускай мове — на 81», — паведаміла дзяўчына.

Наступны наш суразмоўнік — **абітурыент БДУКМ Кірыл БАРАДЗЬКО.** Ён скончыў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Жодзіна». Малады чалавек падзяліўся сваімі перажываннямі: «Хачу паступіць сюды на спецыяльнасць «Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)», бо люблю гэты кірунак, у будучыні планую звязаць з ім сваё жыццё. Вядома, перажываю, але спадзяюся, што ўсё будзе добра».

Дарэчы, Кірыл скончыў сярэднюю школу з залатым медалём і сярэднім балам атэстата 9,8. Экзамен па рускай мове малады чалавек здаў на 98 балаў, гісторыю Беларусі — на 89, грамадазнаўства — на 95.

«У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вучыцца шмат маіх знаёмых. Пасля іх апавяданняў пра вучобу жаданне паступіць сюды яшчэ больш узрастае. Да таго ж я ведаю не так шмат вышэйшых навучальных устаноў, дзе можна авалодаць харэаграфічным мастацтвам. У будучыні хачу стаць харэографам, але таксама і выступаць у якасці артыста».

**Абітурыент БДУКМ Софія МАКАРАНКА** ўжо можа святкаваць перамогу. Сёлета дзяўчына скончыла Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў. «Я ўдзельнічала ў Рэспубліканскім конкурсе харэаграфічнага мастацтва «Dance кангрэс — 2024» і атрымала дыплом лаўрэата трэцяй ступені ў катэгорыі «Дуэт». Дзякуючы гэтаму магу паступіць без уступных экзаменаў. Такая магчымасць вельмі моцна дапамагае. І я вельмі рада і задаволена, што ў мяне атрымалася дасягнуць такіх добрых вынікаў. Буду паступаць на «Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)». З гэтым аддзяленнем бачуся даволі часта. Мы нярэдка працуем разам на дзяржаўных пляцоўках і конкурсах, таму выбрала менавіта Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», — падзялілася яна.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Кацярыны УРБАН.**

